# Функцыі і задачы ў сферы аховы працы

**Артыкул 9. Закона Рэспублікі Беларусь ад 23.06.2008 №356-З «Аб ахове працы» (у рэд. ад 17.07.2023 N 300-З).**

**Паўнамоцтвы рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання і іншых арганізацый, падпарадкаваных Ураду Рэспублікі Беларусь, у галіне аховы працы.**

Рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання і іншыя арганізацыі, падпарадкаваныя Ураду Рэспублікі Беларусь, ажыццяўляюць кіраванне дзейнасцю падпарадкаваных (якія ўваходзяць у склад (сістэму)) арганізацый (далей - падпарадкаваныя арганізацыі) па пытаннях аховы працы праз рэалізацыю паўнамоцтваў уласніка з аналізам эфектыўнасці работы падпарадкаваных арганізацый у галіне аховы працы і выпрацоўкай прапаноў па яе павышэнні, уключаючы:

распрацоўку і прыняцце ў межах сваёй кампетэнцыі тыпавых інструкцый па ахове працы, іншых тэхнічных нарматыўных прававых актаў, якія змяшчаюць патрабаванні па ахове працы, па ўзгадненню з Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны, іншымі рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, якія ажыццяўляюць рэгуляванне і кіраванне ў адпаведных сферах дзейнасці;

аналіз у падпарадкаваных арганізацыях вынікаў атэстацыі працоўных месцаў па ўмовах працы, прычын вытворчага траўматызму і прафесійнай захваральнасці, распрацоўку і рэалізацыю мер па іх прафілактыцы;

распрацоўку і забеспячэнне функцыянавання сістэм кіравання аховай працы, якія прадугледжваюць у тым ліку ўзаемадзеянне ў галіне аховы працы з падпарадкаванымі арганізацыямі;

арганізацыю навучання і праверкі ведаў па пытаннях аховы працы кіраўнікоў і спецыялістаў падпарадкаваных арганізацый;

арганізацыю правядзення навукова-даследчых работ па пытаннях умоў і аховы працы ў межах сваёй кампетэнцыі;

інфармацыйнае забеспячэнне падпарадкаваных арганізацый па пытаннях аховы працы;

прапаганду і распаўсюджванне перадавога вопыту ў галіне аховы працы ў падпарадкаваных арганізацыях, у тым ліку правядзенне аглядаў-конкурсаў на лепшую арганізацыю работы па ахове працы;

міжнароднае супрацоўніцтва па пытаннях аховы працы ў межах сваёй кампетэнцыі;

іншыя паўнамоцтвы ў галіне аховы працы, прадугледжаныя заканадаўствам.

**Source URL:** *https://mpt.gov.by/okhrana-truda-i-pozh-bezopasnost/funkcii-i-zadachi-v-oblasti-ot-be*